# Раздзел IV. БЕЛАРУСЬ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СВЕТУ Ў ПЕРЫЯД РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

## § 31. Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў

ВЯЛІКІЯ ГЕАГРАФІЧНЫЯ АДКРЫЦЦІ
РАБСТВА МЕТРАПОЛІЯ
ЭКСПАНСІЯ ВАСКА ДА ГАМА
КАЛОНІЯ ФЕРНАН МАГЕЛАН
ХРЫСТАФОР КАЛУМБ
ОСТ-ІНДСКАЯ КАМПАНІЯ

**Каланіялізм** — сістэма панавання групы развітых дзяржаў Заходняй Еўропы над астатнім светам, пачынаючы з XVI ст.

**1. Вялікія геаграфічныя адкрыцці і пачатак еўрапейскага каланіялізму.** Вялікія геаграфічныя адкрыцці (канец XV — сярэдзіна XVII ст.) — адна з найбольш значных з'яў у гісторыі чалавецтва. На працягу гэтага перыяду еўрапейцы «адкрылі» і пачалі кантраляваць шмат новых зямель, на якіх былі створаны калоніі. З гэтага часу пачалася эпоха еўрапейскага **каланіялізму**, якая працягвалася да сярэдзіны XX ст.

Прычыны Вялікіх геаграфічных адкрыццяў

Галоўнымі прычынамі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, а значыць і еўрапейскага каланіялізму, зрабіліся пошук новых гандлёвых шляхоў у Індыю і Кі-

## ПЕРАДУМОВЫ ВЯЛІКІХ ГЕАГРАФІЧНЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

- Пагаршэнне ўмоў гандлю Еўропы з краінамі Усходу
- Спыненне Рэканкісты, вызваленне людскіх і матэрыяльных рэсурсаў
- Узрослая мабільнасць насельніцтва
- Назапашванне геаграфічных ведаў
- Стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў
- Развіццё мараплаўства і тэхналогій будавання караблёў

Растлумачце, чаму кожны з указаных фактаў еўрапейскай гісторыі з'яўляецца перадумовай Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

тай, імкненне да пашырэння рынкаў збыту еўрапейскіх тавараў, захоп рэсурсаў і багаццяў. Да таго як еўрапейцы адкрылі марскі шлях у Індыю, гандаль паміж Еўропай і Азіяй у XIV–XV стст. праходзіў па сушы цераз Аравію і Персію і кантраляваўся арабскімі купцамі. Адкрыццё марскога шляху ў Індыю, а затым і Кітай змяніла сітуацыю на карысць еўрапейцаў. Новыя гандлёвыя маршруты цяпер абміналі арабскі свет.

**Пачатак эксплуатацыі**

Ад кантролю над марскім гандлем з далёкімі краінамі Усходу і Амерыкі еўрапейцы досыць хутка перайшлі да захопу тэрыторый, пасля чаго на гэтыя землі абрынуліся плыні перасяленцаў з Еўропы. Заснаваныя імі калоніі ператвараліся ў крыніцу рэсурсаў, магутнасці і росквіту для еўрапейскіх метраполій. Такім чынам, сутнасць каланіялізму заключаецца ў эксплуатацыі калоній еўрапейскімі дзяржавамі-метраполіямі.

**Мэты каланіяльных заваёў**

Падчас каланіяльных заваёў еўрапейцы хацелі перш за ўсё набыць новыя рэсурсы, як людскія (абарачэнне мясцовага насельніцтва ў рабства), так і матэрыяльныя (прадукты сельскай гаспадаркі,



*Англійскія каланісты ў Амерыцы*

карысныя выкапні і г. д.). Паміж Еўропай, Афрыкай і Амерыкай ужо ў XVI ст. склаўся так званы «гандлёвы трохвугольнік». Упершыню ў гісторыі пачалося фарміраванне глабальнай гандлёва-эканамічнай сістэмы.




*«Гандлёвы трохвугольнік» Новага часу*

Немалое значэнне мела стабілізацыя сацыяльнай абстаноўкі ў Еўропе. Для гэтага жабракоў, шукальнікаў прыгод, злачынцаў і іншых непажаданых асоб адпраўлялі ў калоніі. Туды таксама выпраўляліся прадстаўнікі і іншых сацыяльных груп.

Стварэнне калоній у розных частках свету было асноўнай мэтай каланіяльнай экспансіі. Гэта дазваляла метраполіям мець апорныя базы ў розных рэгіёнах свету, што, у сваю чаргу, умацоўвала іх вайсковы патэнцыял, рабіла гандаль больш бяспечным і пашырала сферу іх уплыву. Вялікія геаграфічныя адкрыцці і пачатак каланіялізму абумоўлены не толькі эканамічнымі, але таксама культурнымі, палітычнымі і рэлігійнымі прычынамі. У прыватнасці, важную ролю адыгрывала ідэя пашырэння хрысціянства.

Назавіце складнікі «гандлёвага трохвугольніка» і раскрыйце яго сутнасць.

## САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД ГРАМАДСТВА КАЛАНІСТАЎ У АМЕРЫЦЫ




Даведайцеся, хто такія сервенты. Параўнайце становішча сервентаў і афрыканскіх рабоў.

Пашырэнне еўрапейскіх імперый часцяком апраўдвалася ідэяй першынства еўрапейскай цывілізацыі. Разбуральнае ўздзеянне гэтага працэсу на каланізаваныя народы з'яўляецца агульнапрызнаным. Еўрапейскія дзяржавы часта навязвалі падкантрольнаму насельніцтву ўласныя культурныя і палітычныя сістэмы, ігнаравалі іх унікальныя традыцыі і лад жыцця. Некаторыя культуры і цэлыя народы былі знішчаны ў ходзе або ў выніку гэтай каланізацыі.

Пачатак еўрапейскага каланіялізму суправаджаўся мноствам негатыўных наступстваў для карэнных народаў каланізаваных тэрыторый.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Эпоха еўрапейскіх падарожжаў XV–XVII стст. увайшла ў гісторыю пад рамантычнай назвай «Вялікія геаграфічныя адкрыцці».

1. *Прааналізуйце назву дадзенай гістарычнай эпохі, растлумачыўшы сэнс кожнага са слоў, што яе складаюць.*
2. *Ацаніце гэту назву з пазіцый карэнных народаў Амерыкі, Азіі, Афрыкі, на чые землі ступіла нага еўрапейскіх каланізатараў. Наколькі цяпер вы з ёю згодныя?*
3. *Растлумачце, чаму важна ацэньваць гістарычныя факты з розных пунктаў погляду. Якія якасці асобы ў выніку могуць быць сфарміраваны ў чалавека? Наколькі яны важныя для жыцця ў сучасным свеце?*

**Каланіяльная імперыя Партугаліі**

**2. Стварэнне каланіяльных імперый.** У працэсе каланізацыі паўсталі гіганцкія каланіяльныя імперыі: спярша Іспанская і Партугальская, праз некаторы час — Англійская і Французская. Стварэнне каланіяльных імперый Іспаніі і Партугаліі — адзін з найважнейшых этапаў гісторыі Еўропы і свету




*Свет у сярэдзіне XVIII ст.*

Прасачыце паводле картасхемы рост каланіяльных уладанняў еўрапейскіх дзяржаў, адзначаных у табліцы «Станаўленне каланіяльнай сістэмы ў XVI–XVIII стст.».

**Станаўленне каланіяльнай сістэмы ў XVI–XVIII стст.**

| Метраполія | Калоніі | Перыяд захопу |
|---|---|---|
| Іспанія | Цэнтральная і Паўднёвая Амерыка, Філіпіны | XVI ст. |
| Партугалія | Бразілія, Ангола, Мазамбік | XVI ст. |
| Нідэрланды | Паўднёва-Усходняя Азія, поўдзень Афрыкі | XVII ст. |
| Англія | Паўночная Амерыка, Індыя | XVI–XVII стст.<br>XVIII ст. |
| Францыя | Індыя, Паўночная Амерыка, Гаіці | XVII ст. |

ў цэлым. Напрыканцы XV ст. партугальскія мараплаўцы адкрылі марскі шлях у Індыю, што зрабілася адпраўным пунктам каланізацыі новых зямель у Азіі. Аднак самай вялікай калоніяй Партугаліі была Бразілія, якая месцілася ў Паўднёвай Амерыцы. Партугалія ўтрымлівала яе тэрыторыю больш за 300 гадоў. Значная частка даходаў ад эксплуатацыі калоніі паступала ў метраполію, што выклікала незадавальненне не толькі мясцовага насельніцтва, але і каланістаў. Буйны́мі калоніямі Партугаліі былі таксама Ангола і Мазамбік у Афрыцы.

### Іспанская каланізацыя

Яшчэ больш маштабны характар насіла іспанская каланізацыя Паўднёвай Амерыкі. Фактычна ўвесь кантынент, апроч Бразіліі, апынуўся ў складзе іспанскай каланіяльнай імперыі. Значная частка карэннага насельніцтва была знішчана, таму праз недахоп рабочай сілы іспанцы пачалі ўвозіць неграўрабоў з Афрыкі. За першыя тры стагоддзі іспанскай каланізацыі ў Амерыку перасяліліся 600 тыс. іспанцаў, пераважна мужчын. Іспанская імперыя ў Новым Свеце дасягнула размаху ўжо ў сярэдзіне XVI ст. У 1542 г. Іспанія абвясціла Філіпіны сваёй калоніяй, што зрабілася ключавым пунктам іх імперыі ў Ціхім акіяне. Адначасова завяршалася заваёва Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі.

Растлумачце, чаму менавіта Іспанія і Партугалія былі першымі краінамі, якія сталі рыхтаваць марскія экспедыцыі ў краіны Усходу.

**Каланіяльная экспансія Англіі і Францыі**

Ад XVII ст. галоўнымі гульцамі на полі барацьбы за каланіяльныя ўладанні ў Амерыцы, Азіі і Афрыцы зрабіліся Англія і Францыя. Англія пачала актыўна каланізаваць Новы Свет у пачатку XVII ст.,

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З «Дэкларацыі французскага караля аб заснаванні Ост-Індскай кампаніі» (1664 г.)**

«Артыкул 36. Кампанія мае права пасылаць паслоў і пасольствы да кіраўнікоў Індыі і Мадагаскара ад імя французскага караля; аб'яўляць ім вайну або мір, або чыніць усялякія іншыя дзеянні, накіраваныя на ўмацаванне і пашырэнне французскага гандлю.

Артыкул 37. Вышэйзгаданая кампанія можа дзейнічаць у межах ад мыса Добрай Надзеі да Магеланава праліва ва ўсіх Паўднёвых морах. Дазвол наш даецца кампаніі на 50 гадоў, прычым адлік часу пачынаецца ад дня выхаду першых суднаў, падрыхтаваных кампаніяй, на Усход. Кампанія мае займацца гандлем і навігацыяй у вышэйзгаданых водах, у той жа час абараняючы ўсякія французскія судны ў гэтым рэгіёне, для чаго ёй дазваляецца рэквізаваць або захопліваць патрэбныя ёй караблі, прыпасы, зброю, неабходныя для абароны нашага гандлю і нашых падданых.

Артыкул 38. Усе землі і астравы, адкрытыя суднамі кампаніі, будуць назаўсёды заставацца ў яе ўладанні. Правасуддзе і Права Сеньёра на землях кампаніі чыніцца прадстаўнікамі кампаніі. У сваю чаргу, кароль французскі мае Права Сеньёра над шахтамі, залатымі радовішчамі, грашыма і каштоўнасцямі, а таксама ўсякімі іншымі карыснымі выкапнямі, якія належаць кампаніі. Кароль абяцае карыстацца Правам Сеньёра толькі ў інтарэсах краіны.

Артыкул 40. Мы, кароль Францыі, абяцаем кампаніі бараніць яе прадстаўнікоў і яе інтарэсы супраць усіх і кожнага, выкарыстоўваць сілу зброі ў мэтах падтрымкі свабоды гандлю і навігацыі кампаніі; прадухіляць прычыны ўсякіх цяжкасцей або дрэннага абыходжання з боку каго б то ні было; суправаджаць караблі і грузы кампаніі за наш кошт такой колькасцю ваенных караблёў, якая будзе патрэбна кампаніі, і не толькі каля берагоў Еўропы або Афрыкі, а таксама ў водах Вест- і Ост-Індый».

1. *Якія правы атрымлівала Ост-Індская кампанія? Якія мэты перад ёю ставіліся? Якія сродкі дасягнення мэт дазвалялася выкарыстоўваць?*
2. *На якія тэрыторыі зямнога шара пашыралася ўлада Ост-Індскай кампаніі? Што называлася Вест- і Ост-Індыяй?*
3. *У чым заключалася ўзаемная выгада Ост-Індскай кампаніі і французскіх каралёў?*

ствараючы калоніі з рэлігійных і камерцыйных меркаванняў. Яе галоўным уладаннем зрабіліся 13 калоній у Паўночнай Амерыцы на тэрыторыі сучасных ЗША. У сярэдзіне XVIII ст. узброеныя сілы прыватнай англійскай *Ост-Індскай кампаніі* пачалі заваёву Індыі. Апошняя зрабілася найбуйнейшай у сусветнай гісторыі каланіяльнай здабычай адной еўрапейскай дзяржавы. Пазней яе назавуць «перлінай у брытанскай кароне». Францыя пачала падпарадкаванне Амерыкі ў 1534 г., заснаваўшы калонію ў Квебеку. Галоўнымі ўладаннямі Францыі зрабіліся Канада, Луізіяна, Гаіці.

### Палітыка каланіяльных улад

У кожнай буйной дзяржаве была заснавана ўласная кампанія, надзеленая манапольным правам гандлю з краінамі Усходу, перш за ўсё з Ост-Індыяй. Еўрапейскія дзяржавы імкнуліся ў сваіх каланіяльных імперыях да розных мэт, але былі ў іх палітыцы і агульныя рысы. Як правіла, калоніі стваралі ў мэтах атрымання прыбытку і эксплуатацыі прыродных рэсурсаў, што прыводзіла да жорсткага абыходжання з мясцовым насельніцтвам і эксплуатацыі рабскай працы.

Каланіяльнае кіраванне будавалася на аснове прынцыпу «метраполія — калонія». Мацерыковая дзяржава — *метраполія* — кіравала заваяванымі тэрыторыямі — *калоніямі*. Другія існавалі ў інтарэсах першай і абслугоўвалі яе эканамічныя, палітычныя і культурныя патрэбы. Важным складнікам каланіяльнай эканомікі была эксплуатацыя працоўных рэсурсаў заваяваных тэрыторый. Галоўнымі галінамі вытворчасці з'яўляліся земляробства, здабыча руд, а таксама выраб цукру, тытуню і тэкстылю. Каланіяльная палітыка прыносіла велізарную выгаду метраполіі і мела негатыўныя наступствы для калоній. Эксплуатацыя рэсурсаў і працоўнай сілы вяла да іх збяднення, да прыгнечанага становішча карэннага насельніцтва.

Разам з тым стварэнне каланіяльных імперый значна паўплывала на развіццё сусветнай эканомікі, гандлю, культуры. Каланіяльная экспансія зрабілася адным з ключавых фактараў фарміравання сусветнай эканамічнай сістэмы, прычынай глабальнага падзелу працы.

**3. Асноўныя наступствы еўрапейскага каланіялізму.** Заваёва Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі еўрапейскімі каланізатарамі — адна з найбольш значных і драматычных старонак у гісторыі чалавецтва. Гэты працэс пачаўся ў канцы XV ст., калі іспанскія і партугальскія мараплаўцы адкрылі новыя землі на захадзе, што сталі вядомыя як Амерыка. Затым пачалася бурная і крывавая заваёва большай часткі тэрыторыі Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі.

Крыніцы сыравіны і рынкі збыту тавараў

Галоўным стымулам каланізацыі Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі было жаданне еўрапейскіх дзяржаў адшукаць новыя крыніцы сыравіны і здабываных прадуктаў. Адным з самых каштоўных сыравінных рэсурсаў было золата, радовішчы якога знаходзіліся ў Мексіцы і Перу, а таксама срэбра ў Балівіі і Мексіцы. Апроч таго, у Паўднёвай Амерыцы былі знойдзены залежы жалеза, медзі і свінцу, алмазы і іншыя каштоўныя камяні.

Пашырэнне каталіцтва

Апроч валодання матэрыяльнымі каштоўнасцямі каланізатары імкнуліся пашырыць межы хрысціянскага свету і прыцягнуць у яго шэрагі прыхільнікаў каталіцызму. З гэтай мэтай на новых тэрыторыях былі пабудаваны місіі і цэрквы, у якіх місіянеры вучылі мясцовых жыхароў новай веры і выхоўвалі іх у еўрапейскім духу.

Эксплуатацыя карэнных народаў Амерыкі

Заваёва Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі была важным этапам у гісторыі свету, які паўплываў на многія аспекты жыцця, у тым ліку на эканоміку, палітыку, культуру і навуку. Гэта не быў аднародны працэс, кожны рэгіён меў свае асаблівасці. Напрыклад, у Паўночнай Амерыцы французскія каланіза-

тары схіляліся да мірнага суіснавання з мясцовымі індзейцамі, тады як іспанскія і партугальскія каланізатары ў Паўднёвай Амерыцы былі больш агрэсіўныя і жорсткія ў сваіх метадах падпарадкавання карэннага насельніцтва.

Каланізацыя прывяла да прыгнёту і эксплуатацыі карэннага насельніцтва, спарадзіла такую пачварную з'яву, як гандаль рабамі. У той жа час яна была крыніцай узбагачэння многіх еўрапейскіх дзяржаў, стымулявала іх эканамічнае развіццё і тэхналагічны прагрэс.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ





Да прыходу еўрапейцаў у Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы жылі сотні плямёнаў карэнных народаў, якім заваёўнікі памылкова далі агульную назву «індзейцы». Сярод карэнных народаў Амерыкі можна назваць такія плямёны, як сіу, наваха, ма́я, апачы, чэрокі, ацтэкі, магаўкі, іракезы, інкі і мноства іншых.

Абярыце любое сярод названых або іншых плямёнаў карэнных народаў Амерыкі і складзіце яго гістарычнае апісанне паводле плана:

*1) рэгіён пражывання;*
*2) паходжанне назвы;*
*3) заняткі;*
*4) цікавыя факты з культуры і паўсядзённага жыцця;*
*5) лёс пасля ўварвання еўрапейцаў.*

*Каланіяльная экспансія XVI–XVIII стст. аказала велізарны ўплыў на гісторыю свету і фарміраванне сучаснага грамадства. З аднаго боку, гэта была эпоха адкрыццяў, новых ведаў і тэхналагічнага прагрэсу. Вялікія геаграфічныя адкрыцці прывялі да кантакту розных цывілізацый і культурных традыцый. Гэта, у сваю чаргу, дало штуршок фарміраванню новых культурных і сацыяльных з'яў. Культурны абмен спрыяў пашырэнню новых тэхналогій, ідэй, ведаў і светапогляду. З другога боку, каланіялізм прывёў да трагічных наступстваў для многіх народаў — гвалту, прымусовага прыняцця чужых звычаяў і кульурных каштоўнасцей або практычна поўнага знішчэння. Іх землі і рэсурсы былі заваяваны і зрабіліся аб'ектам эксплуатацыі.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| XVI–XVIII стст. — еўрапейская каланіяльная экспансія | XVI–XVII стст. — барацьба Вялікага Княства Літоўскага за палітычную самастойнасць ад Польшчы |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Што зрабіла Вялікія геаграфічныя адкрыцці патрэбнымі, а што — магчымымі?
2. Выкарыстоўваючы картасхему на с. 118, ахарактарызуйце новыя імперыі, што ўтварыліся ў XVI–XVIII стст.
3. Складзіце тэзісны план адказу на тэму «Карціна свету да і пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў».
4. З дапамогаю памяткі «Як ацэньваць гістарычныя факты» дайце ацэнку еўрапейскай каланіяльнай экспансіі ў XVI–XVIII стст.